27 ліпеня – Дзень Незалежнасці
*Стар. 4-6*

Мнение экономиста
*Стар. 8*

Камни с неба
*Стар. 9*

№8
ЛІПЕНЬ 2007

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў



Рыгор Кастусёў: Мы вітаем плюралізм, але дзе ж вашыя прапановы?



Палымяны барацьбіт зь любымі вэртыкалямі й бюракратамі Валадар Цурпанаў ні на хвіліну не даваў спакою арганізатарам

# Канфэрэнцыя адбылася

У мінулую нядзелю ў Магілеве адбылася абласная канфэрэнцыя аб'яднаных дэмакратычных сілаў, на якой былі ўхваленыя пляны сумесных дзеяньняў на перыяд да выбараў 2008-га года. І хаця ў канфэрэнцыі адмовіліся ўдзельнічаць камуністы і партыя працы, на яе ход гэта істотна не паўплывала.

Была абраная Рада з 11 чалавек, якія прадстаўляюць усе рэгіёны, дзе створаныя кааліцыі, а таксама партыйныя арганізацыі вобласьці. Магчымасьць увайсьці ў склад Рады мае таксама прадстаўнік грамадзкіх арганізацыяў, чыя Асамблея пакуль ня вызначылася з кандыдатурай, ды дзьве ўпамянутыя раней партыі, калі яны гэтага захочуць.

Уражвае, што мерапрыемства было досталь якасна падрыхтаванае, а аператыўнасьць рэдакцыйнай камісыі, здолеўшай выправіць заўважаныя ў тэкстах прынятых дакумэнтаў недарэчнасьці яшчэ да заканьчэньня працы, увогуле вызывае павагу.

Аб тым жа, што ня ўсё ў нас ідэальна, сьведчыць не зусім добрая яўка дэлегатаў – з васьмідзесяці аднаго прыбыў толькі шэсьдзесят адзін, што, тым ня меньш, не перашкодзіла наяўнасьці кворуму (патрэбна было дзьве траціны).

Іньшыя матар'ялы пра канфэрэнцыю чытайце на наступных старонках

*Іван МАРОЗАЎ*

№8 ліпень 2007 Выбар
Газета Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

## МАГІЛЁЎСКАЯ АПАЗІЦЫЯ НЕ ПАСЛУХАЛАСЯ МІНСКАЙ “ВЕРТЫКАЛІ”

Дэлегаты ад партыяў і грамадскіх аб’яднанняў прынялі стратэгію сумесных дзеянняў да парламенцкіх выбараў 2008 году. Таксама была створаная каардынацыйная рада АДС па Магілёўскай вобласці.

Туды ўвайшлі прадстаўнікі Партыі БНФ, Аб’яднанай грамадзянскай партыі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада), Партыі свабоды і прагрэсу, Свабоднага прафсаюзу, раённых дэмакратычных кааліцыяў. Крыху пазней павінен далучыцца прадстаўнік ад грамадскіх аб’яднанняў вобласці.

Лідэр абласной арганізацыі АГП Уладзімер Шанцаў сцвярджае, што Палітрада АДС не ўхваліла правядзення абласной канферэнцыі: “У пятніцу ў Мінску былі прынятыя два рашэнні: распрацаваць стратэгію па рэгіёнах і забараніць правядзенне канферэнцыяў без дазволу Палітрады”. Уладзімер Шанцаў называе правядзенне абласной канферэнцыі АДС самадзейнасцю.

Яго папраўляе лідэр абласной арганізацыі Партыі БНФ Рыгор Кастусеў: “Палітрада прыняла рашэнне не рэкамендаваць правядзенне канферэнцыяў да распрацоўкі стратэгіі па рэгіёнах”. Але, па меркаванні Костусева, “гэтую стратэгію можна чакаць і год, і два”. Да таго ж, як ён кажа, магілёўскія дэмакраты лепей за мінскіх разбіраюцца ў пытаннях свайго рэгіёну. Костусеў лічыць, што трэба будаваць стасункі пераважна на падмурку гарызантальных, а не вертыкальных сувязяў: “Гэта ўжо даказала сваю эфектыўнасьць падчас мінулых мясцовых выбараў”.

*Радые Рацыя*

## КОММЕНТАРИЙ РЕДАКТОРА

### ЛЕКЦИЯ "О ВРЕДЕ САМОДЕЯТЕЛЬНОСТИ"

Как говорил великий Аркадий Райкин в одном из своих бессмертных номеров – “Лекции о вреде самогона”, слово это состоит из двух частей: “Само” (значит – “Сами”) и “Гон” (значит – “Гоним”). “Ну из чего гоним – знаете?”. В зале смеялись, что означало: “Знаем”.

Самодеятельность – сложносокращенное слово состоящее также из двух частей: “Само” (значит – “Сами”) и ключевого - “Деятельность”, что в пояснении вообще не нуждается. Что делать – мы также знаем, а посему сами будем действовать, у себя дома, не ожидая чьих-то дозволов или запретов. А в отношении тех, кто, выражаясь словами того же Райкина, “обосрамился” в ходе прошлых избирательных кампаний, но продолжает надувать щеки, и читать нам лекции о вреде самодеятельности и пользе ЦУ из “центральных органов”, я лично могу сказать одно: “Прыдзе каза да ваза”. Ну, а не “прыдзе”... Одной-то в наших политджунглях долго пастись проблемно. Так что еще раз приглашаю к само-совместно-деятельности всех, кому демократическая Беларусь дороже персональных амбиций.

*Эдуард БРОКАРЕВ*

## ВОСЬ ШТО СКАЗАЎ У СВАІМ ДАКЛАДЗЕ ПРАДСТАЎНІК ШКЛОЎШЧЫНЫ, БЫЛЫ КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ НА МЯСЦОВЫХ ВЫБАРАХ ПЁТАР МІГУРСКІ:



-- Любы працэс, асабліва палітычны, патрабуе асэнсаваньня і ацэнкі. Своеасаблівасьць працэсу, у якім мы з вамі прымаем удзел, -- у тым, што мы выступаем піянэрамі аб’яднаўчага працэсу ў рэгіёне з усімі тымі асаблівасьцямі, якія ў нас склаліся. Чым далей адыходзяць мінулыя выбарчыя кампаніі, асабліва кампанія па выбарах у мясцовыя саветы, -- тым больш расьцемая ўпэўненасьць у прадукцыйнасьці аб’яднаўчага працэсу, які выявіўся ў стварэньні кааліцыі дэмакратычных сілаў. Адметнасьць яго палягае на тым, што ядналіся прадстаўнікі партыяў і грамадзкіх суполак. Ня самі партыі й суполкі па загадзе “зьверху”, як гэта раней было ў нас, а іхныя прадстаўнікі па ўласных перакананьнях. Узгадаем, што перад тым спроба аб’яднацца, якую зрабілі партыйныя структуры і грамадзкія арганізацыі ў іхных поўных складах, без уліку ўласных меркаваньняў і намераў сваіх сябраў, дала збой. Наша кааліцыя на той момант ня тое, што раскалолася зусім, але рэальна паўстала перад такой небясьпекай. Вось, як гаворыцца, сьвежы прыклад. Нядаўна да нас на партыйны сход прыязджаў спадар Ляўковіч, першы намесьнік старшыні БСДП(Г). Ён у сваім выступе 7 разоў зь негатыўным адценьнем узгадаў прозьвішча Аляксандра Мілінкевіча, а прозьвішча кіраўніка краіны, у апазыцыі да якога знаходзіцца партыя і асабіста сп.Ляўковіч, не было названае ані разу. Нам трэба пазьбегнуць падобнага, а менавіта таго, каб у нашай кааліцыі былі людзі, якія найпершым чынам нацэленыя на ўнутрыпартыйную барацьбу. Змагацца трэба, як гаворыцца, на падыходах, перад уступленьнем у кааліцыю. А далей усе павінны быць настроеныя на адну мэту: на пабудову вольнага дэмакратычнага грамадзтва. У нас з вамі ёсьць з кім змагацца. Досьвед нашай кааліцыйнай працы невялікі, яшчэ няма й году нашаму адзінству. Аднак пэўныя моманты ўжо можна ацаніць станоўча. Першае: у мінімальна кароткі тэрмін было знойдзенае ўзаемаразуменьне з прадстаўнікамі розных палітычных партыяў і грамадзкіх арганізацый. Другое: на рэгіянальным узроўні створаныя рэальна працуючыя структуры. Трэцяе: практычна ў кожным рэгіёне былі дасягнутыя пастаўленыя мэты, а менавіта -- у мясцовыя саветы былі вылучаныя актыўныя прадстаўнікі дэмакратычных сілаў. І чацьвертае: досьведам нашай супольнай працы пачалі актыўна цікавіцца ў іншых рэгіёнах краіны. (Сёньня на нашую канфэрэнцыю зьбіраліся прыехаць прадстаўнікі Менскай вобласьці, але нешта ім перашкодзіла). Фармальна мы з вамі выбары ня выйгралі, але фактычна гэта яшчэ нявырашанае пытаньне – ці прайгралі. Вось вам прыклад. Супрацоўніца Шклоўскага райвыканкама неафіцыйна павіншавала мяне і Рыгора Кастусёва (мы зь ім, як вядома, балятаваліся па месцы жыхарства) зь перамогай на выбарах: і раённых, і абласных. Гэта сьведчыць і пра тое, што там, дзе мы сапраўды працавалі, выбаршчыкі нас падтрымлівалі. Нельга, канешне, абагульняць сытуацыю, было і шмат памылак. Я не ўпершыню вымушаны гаварыць, напрыклад, аб адсутнасьці ў

нашай абласной структуры пэўных паўнамоцтваў. Мы па-ранейшаму баімся ствараць так званую "вэртыкаль", спадзяючыся выключна на "гарызантальныя" сувязі і адносіны. Гэта псіхалягічна можна зразумець, аднак жа інтарэсы справы вымушаюць зьвяртацца да гэтай праблемы і шукаць яе вырашэньне. Думаю, што нам варта знайсьці "залатую сярэдзіну" у гэтым пытаньні. Тым больш, што нельга надта спрошчана ўспрымаць самое паняцьце "вэртыкальных" сувязяў і адносінаў. Трэба ўзвысіць кіруючую ролю абласной структуры (абласнога зьвяна, абласной ступені) у нашай кааліцыі. Не заўсёды эфэктыўна працавалі нашыя кіраўнікі Аляксандар Сілкоў і Рыгор Кастусёў. Недастаткова была задзейнічаная наша юрыдычная служба, юрыдычная дапамога. Больш таго: спадар Сілкоў, як вядома, ня здолеў зарэгістравацца кандыдатам у дэпутаты. Гэта, як гавораць у такіх выпадках, пракол, за які трэба адказваць. Залішне казаць, што ўсе мы адчувалі недахоп рэсурсаў для забесьпячэньня дзейнасьці сябраў кааліцыі і кандыдатаў у дэпутаты ад яе. Нарэшце, кааліцыя яўна саступала ў сваім аўтарытэце ў часе выбарчай кампаніі пэўным партыйным структурам. Нам, як кааліцыі, яшчэ трэба вучыцца працы ў пэрыяды выбарчых кампаніяў. Тым больш, што, як мне падаецца, надалей роля падобных нашай з вамі кааліцыяў будзе ўзрастаць у параўнаньні з роляй чыста партыйных арганізацый. Тут прычыны відавочныя ўжо сёньня: малая колькасьць партарганізацыяў і нізкая папулярнасьць іх сярод насельніцтва. Што нам трэба рабіць бліжэйшым часам? Працаваць над кансалідацыяй дэмакратычна настроеных грамадзянаў. Мы найперш павінны стаць цэнтрам для прыцягненьня такіх людзей. Трэба сфармаваць абласную структуру кіраўніцтва дэмакратычнымі сіламі і вызначыць яе паўнамоцтвы. Важна вызначыцца ў прыярытэтах. Сёньня частка дэмакратычных сілаў вядзе барацьбу зь Мілінкевічам. Мы павінны разумець, што ў нас ёсьць агульны праціўнік, і гэта, як зразумела, зусім не Мілінкевіч. Надзвычай важна працаваць над рэсурсовым забесьпячэньнем кааліцыйнай працы. Мяркую, што пакуль нам ня варта сьпяшацца зь юрыдычным афармленьнем кааліцыі, няхай пакуль яна застаецца на ўзроўні грамадзянскай ініцыятывы. І нарэшце, трэба ўжо сёньня нацэльвацца ня толькі на парлямэнцкія выбары, але і на прэзыдэнцкія -- у выглядзе выпрацоўкі канцэптуальных прыярытэтаў разьвіцьця краіны і грамадства.

## СУДАКЛАДЧЫК, СТАРШЫНЯ АБЛАСНОЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПАРТЫІ БНФ РЫГОР КАСТУСЁЎ БЫЎ БОЛЬШ АПТЫМІТЫЧНЫМ:

- Я лічу, што абедзьве выбарчыя кампаніі (прэзыдэнцкую і ў мясцовыя саветы) мы з вамі правялі збольшага добра. Па меншай меры, трэба прызнаць, што мы зрабілі ўсё магчымае ў цяперашніх варунках для грамадзкай і палітычнай працы. Там, дзе былі нашыя сябры (маю на ўвазе нашу кааліцыю), там паўсюль былі вылучаныя кандыдаты. Там паўсюль праводзілася іншая выбарчая праца, інфармацыйная і агітацыйная ў прыватнасьці. А там, куды мы, як гаворыцца, не дабеглі, там і працы дэмакратычнай не было. Нагадаю, дзе ж мы былі. Мясцовыя дэмакратычныя кааліцыі былі ўтвораныя ў Магілёве, Бабруйску, Горках, Крычаве, Шклове. У адным кроку ад стварэньня кааліцыі спыніліся ў Бялынічах. Менавіта тут і была найбольш актыўная праца на выбарах. Пасьля выбарчай кампаніі мы намерваліся правесьці канфэрэнцыю дэмакратычных сілаў, каб падвесьці вынікі і вызначыцца надалей. Вось толькі цяпер гэта робім. На жаль, у канфэрэнцыі не прымаюць удзел некаторыя партарганізацыі "левага кірунку". Магчыма, што такім чынам яны адказваюць нам на наш няўдзел у папярэдняй абласной канфэрэнцыі дэмакратычных сіла. Пра гэта шмат ужо было сказана, ня буду паўтарацца. Скажуц толькі, што прычына нашага няўдзелу была маральная і зьвязаная была з тымі парушэньнямі і памылкамі, якія Палітрада Аб'яднаных дэмсілаў і Аркамітэт па скліканьні Кангрэсу прызнаць не захацелі. А мы не маглі мірыцца з тым, што такія непрыгожыя рэчы робяцца ў нашай дэмакратычнай супольнасьці. Гэты наш сход мае на мэце вызначыцца ў адносінах да маючых адбыцца ў наступным годзе праляманцкіх выбарах у краіне, і ў стаўленьні да пэрспэктываў самой рэгіянальнай кааліцыі. Па-ранейшаму большасьць нашых дэмакратычных арганізацый стаіць на тым, што трэба мець кансалілаванае рашэньне. І гэта правільна, тым больш, што кааліцыя нашая ўмацавалася, захавала рабочы тонус і мае намер працягнуць сваю аб'яднаўчую супольную працу. Нашы спадзяваньні на гэта недарэмныя. Пра гэта гаворыць сам склад сёньняшняй канфэрэнцыі. Хто тут ў зале? Найперш тыя, хто прайшоў свой выбарчы шлях да канца, да ўключэньня свайго прозьвішча ў выбарчы бюлетэнь. Тут тыя, хто непасрэдна пацярпеў ад рэпрэсый улады за сваю пазыцыю і сваю дэмакратычнцю працу. Тут вызначаныя нашым аргкамітэтам VIP-пэрсоны рэгіянальнага дэмакратычнага руху. Тут пасланцы ад кожнай партыйнай арганізацыі дэмакратычнага кірунуку, якія скарысталіся такой магчымасьцю. Зразумела, што тут па аднаму прадстаўніку ад мясцовых кааліцый, створаных пратакольна, афіцыйна. Было таксама прапанавана дэлегаваць сваіх пасланцоў абласной асамблеі дэмакратычных грамадзкіх арганізацый і недзяржаўным прафсаюзам.

*Падрыхтаваў Віктар Войт*

## СПІС КААРДЫНАЦЫЙНАЙ РАДЫ АДС МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Абакановіч Эдуард | ад абласной арганізацыі АГП. |
| 2. | Брокараў Эдуард | ад Горацкай рэгіянальнай кааліцыі. |
| 3. | Кабанчук Таіса | ад Бабруйскай рэгіянальнай кааліцыі |
| 4. | Кастусёў Рыгор | ад абласной арганізацыі БНФ. |
| 5. | Мігурскі Пётр | ад Шклоўскай рэгіянальнай кааліцыі. |
| 6. | Новікаў Юрась | ад Магілёўскай арганізацыі Свабоднага прафсаюза. |
| 7. | Няроўны Сяргей | ад Крычаўскай рэгіянальнай кааліцыі. |
| 8. | Сілкоў Аляксандр | ад аргкамітэта па стварэнню ПСП. |
| 9. | Стральцоў Сяргей | ад Магілёўскай гарадзкой кааліцыі. |
| 10. | Фамін Сяргей | ад абласной арганізацыі БСДП(Г). |
| 11. | Ходзька Ігар | ад Бабруйскай рэгіянальнай кааліцыі. |

№8 ліпень 2007 **Выбар**
Газета Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў



# Кропка яшчэ не пастаўлена

## 27 ліпеня – Дзень Незалежнасці

Магчыма, убачыўшы гэтую дат, нехта ўспомніць, што зусім нядаўна,

3 ліпеня, у нас нешта падобнае ўжо было. Але ж частка чытачоў таксама памятае, што і дзень 27 ліпеня не так даўно адзначаўся ў Рэспубліцы Беларусь як найвышэйшае дзяржаўнае свята. Дык што і калі мы святкуем? Прапануем погляд гісторыка.

Горкі – горад невялікі, знаёмых – шмат і таму пры сустрэчах напярэдадні і непасрэдна 3 ліпеня аўтар гэтых радкоў віншаваў суразмоўцаў са святам і між іншым праводзіў своеасаблівае даследаванне: пытаў, а што мы будзем святкаваць? Як ні дзіўна, многія не здолелі адказаць на гэтае пытанне дакладна. Адны нагадвалі аб вызваленні Мінска ад акупантаў у мінулай вайне, іншыя – вялі гаворку аб вызваленні ўсёй Беларусі, некаторыя ўспаміналі нават пра нейкі рэферэндум. Падобныя разыходжанні былі і ў назве свята.

Ды што казаць пра выпадковых суразмоўцаў, калі нават на дзяржаўных СМІ ў выступленнях асобаў часам гучала блытаніна ў назве свята, якое адзначалася 3 ліпеня: ці то Дзень Рэспублікі, ці Дзень незалежнасці, ці Дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Давайце адновім храналогію падзей і паспрабуем разабрацца калі, што і чаму мы святкуем.

Адзначым адразу, большасць справядліва звязвае дзень 3 ліпеня з Другой сусветнай вайной, у якую беларусы былі ўцягнуты літаральна з першых дзён верасня 1939 года. Яшчэ больш дакладна – з перыядам акупацыі Беларусі нацысцкімі захопнікамі 1941–1944 гг. у ходзе Вялікай Айчыннай вайны.

Вядома, што напад германскіх войскаў на СССР пачаўся 22 чэрвеня 1941 года. За тыдзень яны прасунуліся на ўсход на 400 км і 28 чэрвеня занялі Мінск. На захад ад сталіцы ў гіганцкім "мяху" апынуліся асноўныя сілы Беларускай ваеннай акругі. Звыш 300 тысяч вайскоўцаў трапіла ў палон, каля 400 тысяч загінула. Немцы захапілі больш за 60 велізарных вайсковых складоў і да канца жніўня акупавалі ўсю Беларусь.

Пакінем у баку пытанне аб тым, чаму Чырвоная Армія, нягледзячы на велізарную падрыхтоўку Савецкага Саюза да вайны, ў першыя дні пацярпела катастрофу. Факт, што Беларусь надоўга апынулася пад нацысцкай акупацыяй.

Толькі праз тры гады ў ходзе ажыццяўлення вайсковай аперацыі "Баграціён" 3 ліпеня 1944 годы быў вызвалены Мінск, 28 ліпеня – Брэст. Нацысцкая акупацыя Беларусі скончылася.

Такім чынам, дата 3 ліпеня 1944 г. увайшла ў гісторыю як дзень вызвалення сталіцы БССР і ўспрымалася як дзень вызвалення Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў.

Аднак ці стала Беларусь незалежнай у 1944 годзе?

Адказ ляжыць на паверхні. Каб ён стаў больш відавочны, зноў звернемся да мінулага.

У перамогу над фашызмам Беларусь унесла не меншы ўклад, чым Францыя ці Польшча. У рэгулярнай арміі ваявала больш за мільён жыхароў рэспублікі, добра вядомы масавы партызанскі і падпольны рух на Беларусі, многія беларусы былі ўдзельнікамі Супраціўлення ў еўрапейскіх краінах. Таму невыпадкова кіраўнікі антыгітлераўскай кааліцыі надалі БССР права заснавальніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў (ААН). Тым самым быў прызнаны міжнародны аўтарытэт Беларусі.

Толькі з гэтым не лічыўся крамлёўскі дыктатар. Сталін пайшоў на уступкі польскім правячым колам і ў верасні 1944 г. было прынята рашэнне аб перадачы Польшчы 20 раёнаў беларускай тэрыторыі. Другі раз у гісторыі Расія і Польшча падзялілі беларускі народ і яго нацыянальнае багацце. Як адзначаюць даследчыкі, "Сталін шукаў сярод палякаў верных саюзнікаў, а з беларусаў Беласточчыны на ўсякі выпадак хацеў зрабіць у Польшчы "пятую калону".

Хіба было б такое магчыма, калі б Беларусь была незалежнай?

Ды гэта ж не ўсё. У 1946–1953 гг. пад рэпрэсіі сталінскага рэжыму падпала каля 50 тыс. жыхароў Беларусі. Цэлая нацыя апынулася пад следствам сталіністаў толькі таму, што не па сваёй волі знаходзілася пад нацысцкай акупацыяй.

Дададзім сюды яшчэ татальную русіфікацыю, якая паслядоўна праводзілася па ўсіх напрамках грамадска-палітычнага і культурнага жыцця – у кадравай палітыцы, у адукацыі, навуцы, культуры.

За 1941–1946 гг. працэнт рускіх ў складзе наменклатуры ЦК КПБ(б) – рэестр кіруючых работнікаў вышэйшага узроўню – узрос з 19,5 да 26,9. У 1951 г. з 33 чальцоў урада БССР было толькі 9 беларусаў. Кампартыю Беларусі да 1956 г. узначальвалі толькі "парашутысты", гэта значыць тыя, каго зверху спускала Масква: П.Панамарэнка, М.Гусараў, М.Патолічаў. Толькі з 1956 г. партыйнае кіраўніцтва на Беларусі Масква стала давяраць беларусам: К.Мазураў, П.Машэраў і іншыя, але і яны ніколі не былі сапраўды самастойнымі беларускімі кіраўнікамі.

У пасляваенныя гады адбывалася мэтанакіраванае вытручванне беларускасці. Яно праводзілася самымі рознымі спосабамі: грубымі рэпрэсіямі, як працяг даваенных рэпрэсіяў супраць "нацдэмаў" (нацыянальных дэмакратаў), ідэалагічнай апрацоўкаў насельніцтва, насаджэннем культу асобы Сталіна і асабліва праз рускамоўную адукацыю. Змянялася савецкае кіраўніцтва, але гэты працэс не спыняўся ніколі. На пачатку 1980-х гг. у беларускіх гарадах не было ніводнай беларускай школы.

Палітыка "Перабудовы", распачатая ў 1985 годзе, стварыла прынцыпова новую сітуацыю ў Савецкім Саюзе. Чытачы старэйшага ўзросту памятаюць, што напрыканцы 1980-х гг. ў СССР справа дайшла да ўзброеных міждзяржаўных і міжэтнічных сутычак. Паміж Азербайджанам і Арменіяй яны перараслі ў буйнамаштабныя баявыя дзеянні. Тагачаснае кіраўніцтва СССР, нягледзячы на асобныя спробы выкарыстання сілавых метадаў, пайшло па цывілізаванаму

прававаму шляху. Былі зроблены пэўныя крокі насустрач інтарэсам саюзных рэспублік.

Паправіць становішча не ўдалося: нарастаў недавер да цэнтра і да асобных рэспублік. Асабліва адчувала гэта Расія, якую абвінавачвалі ў імперскіх імкненнях. Каб паменшыць прэтэнзіі да сябе, расійскае кіраўніцтва пайшло на неардынарны крок: 12 чэрвеня 1990 г. быў абвешчаны дзяржаўны суверэнітэт Расійскай Федэрацыі (у Расіі гэты дзень і зараз адзначаецца як агульнадзяржаўнае свята). Крыху пазней, 16 ліпеня, аб сваім суверэнітэце заявіла Ўкраіна.

27 ліпеня 1990 г. было вырашана пытанне аб суверэнітэце Беларусі. У гэты дзень Вярхоўны Савет БССР урачыста прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

У Дэкларацыі абвяшчалася, што Беларусь – "суверэнная дзяржава, якая ўсталявана на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народу ў вызначэнні свайго лёсу" (арт. 1).

Вышэйшай мэтай суверэнітэту прызнавалася забеспячэнне свабоднага развіцця і дабрабыту грамадзян рэспублікі.

Носьбітам суверэнітэту краіны і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады абвяшчаўся беларускі народ.

У адпаведнасці са зместам Дэкларацыі з дня яе прыняцця на тэрыторыі рэспублікі абвяшчалася вяршэнства Канстытуцыі і законаў Беларускай ССР, паўната ўлады рэспубліканскіх дзяржаўных органаў на ўсёй тэрыторыі краіны, самастойнасць і незалежнасць Беларусі ў міжнародных зносінах. Па сутнасці гэта азначала спыненне дзейнасці на Беларусі саюзных законаў.

У Дэкларацыі заяўлялася аб забеспячэнні правоў асобы, ператварэнні тэрыторыі краіны ў без'ядзерную зону, а Беларусі – у нейтральную дзяржаву.

Дэкларацыя ўтрымлівала прававыя палажэнні па асноўных напрамках жыцця суверэннай Беларусі: уласнасці на тэрыторыю, арганізацыі сваёй фінансавай сістэмы, ваеннага будаўніцтва, юрыспрудэнцыі, адукацыі, вырашэнне пытанняў культуры і духоўнага развіцця беларускай нацыі і іншых нацыянальных супольнасцяў краіны і г.д.

Звяртаю ўвагу чытачоў, што абвяшчэнне суверэнітэту не было накіравана на разрыў шматбаковых сувязяў з іншымі рэспублікамі. Наадварот, ў канцы 1990 г. і пачатку 1991 г. былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве Беларусі ў розных сферах з Расіяй, Украінай і Казахстанам.

Перазаключэнне дагавораў паміж рэспублікамі сведчыла аб ўскосным юрыдычным прызнанні ўрадамі ўжо суверэнных краін нядзейснасці саюзнага дагавора 1922 г.

Гэта разумела і саюзнае кіраўніцтва начале з прэзідэнтам М.Гарбачовым, пазіцыя якога была накіравана на захаванне цэласнасці краіны. Яна была падмацавана вынікамі рэферэндуму аб будучыні Саюза (сакавік 1991 г.). Ён прайшоў у 9 з 15 савецкіх рэспублік. Звыш 3/4, галасаваўшых выказаліся за захаванне абноўленага СССР. На Беларусі "за" прагаласавала 82,7%.

Аднак перабольшваць значэнне рэферэндуму, як гэта робяць некаторыя аўтары, нельга па наступных прычынах.

Па-першае, апытання наконт "сохранения" або "несохранения" СССР не было.

Вось тое пытанне: "Считаете ли Вы необходимым сохранение (выдзелена мною – А.К.) Союза Советских Социалнстических Республик как обновленной Федерации равноправных суверенных республик, в которой будут в полной мере гарантироваться права и свободы человека любой национальности?".

Бачыце, падобна на тое, як разумная маці пытае ў дзіцяці: якую ты будзеш есці кашу – манную ці аўсяную? Выбраць (прагаласаваць) можаш, але есці ўсё роўна прыдзецца. Так і тут, варыянтаў не было. Нягледзячы на ветлівае "считаете ли Вы", прапанавалася выбіраць паміж "лепшым" ("обновленным") і фактычна старым (а значыць горшым) варыянтамі Саюза. Хто ж з нармальных людзей будзе галасаваць за горшае? Заставалася галасаваць за "обновленный" Саюз.

Па-другое, канкрэтны змест і тэрміны мяркуемага абнаўлення заставаліся неяснымі для саміх ініцыятараў рэферэндуму. Увогуле, спалучыць захаванне Саюза і адначасова забяспечыць суверэнітэт рэспублік было наўрад ці магчыма. Як паказаў ход падзей, значная частка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва імкнулася захаваць СССР як унітарную (з адзіным моцным кіруючым цэнтрам) дзяржаву. 18–21 жніўня 1991 г. група вышэйшых дзяржаўных дзеячаў здзейсніла ў Маскве беспаспяховую спробу дзяржаўнага перавароту (так званы "жнівеньскі путч").

Менавіта ў гэты складаны час прынятая раней Дэкларацыя стала прававой асновай для выхаду рэспублікі з надзвычайнага становішча. 25 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў рашэнне аб наданні Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР статуса канстутыцыйнага акта. Гэта значыць, Дэкларацыя стала выконваць ролю часовай канстытуцыі Беларусі. Тым самым быў пакладзены пачатак новага перыяду найноўшай гісторыі Беларусі.

Важнасць гэтага дакумента разумела падаўляючая большасць дэпутатаў тагачаснага Вярхоўнага Савета краіны, калі ў верасні 1991 г. прыняла рашэнне аб увядзенні агульнадзяржаўнага свята Рэспублікі Беларусь Дня Незалежнасці 27 ліпеня.

Цікава, што спачатку былі прапанаваны дзве даты: 25 сакавіка (у гэты дзень 1918 г. была абвешчана незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі) і 1 студзеня (дзень абвяшчэння ў 1919 г. Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь). Гэта важныя даты на шляху аднаўлення беларускай дзяржаўнасці, але тут сутыкнуліся палітычныя сімпатыі дэпутатаў.

У выніку абмеркавання дэпутаты знайшлі кампрамісны варыянт і палічылі прызнаць найбольш прымальнай для грамадства датай агульнадзяржаўнага свята Дня Незалежнасці дзень прыняцця Дэкларацыі аб дзяржуаўным суверэнітэце БССР – 27 ліпеня.

За 1992–1996 гг. святкаванне 27 ліпеня Дня Незалежнасці ператваралася ва ўстойлівую традыцыю.

Як жа гэтае свята перакінулася на 3 ліпеня?

У 1996 г. прэзідэнт Беларусі А.Лукашэнка ініцыяваў чарговы рэферэндум для зацвярджэння новай канстытуцыі Беларусі, якая яшчэ больш узмацняла прэзідэнцкія паўнамоцтвы. Рэферэндум адбыўся 24 лістапада 1996 г. На гэтым рэферэндуме была падтрымана прапанова прэзідэнта аб перанясенні Дня незалежнасці з 27 ліпеня на 3 ліпеня

Канечне, узнікае пытанне, навошта спатрэбілася гэты перанос і менавіта на гэтую дату?

Афіцыйнае тлумачэнне адно – 3 ліпеня 1944 г. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была вызвалена сталіца савецкай Беларусі г. Мінск. Аднак гэтая дата, як мы ведаем, і так кожны год адзначалася як Дзень вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў і таму многія ў рэспубліцы лічылі падмену непатрэбнай і нават безпадстаўнай.

Яшчэ раз зададзім пытанне: хіба пасля 1944 г. БССР стала незалежнай? Адказ відавочны – не. З 1944 г. на працягу 47 гадоў, да снежня 1991 г.

Беларусь юрыдычна заставалася саюзнай рэспублікай. Да восені 1991 г. партыйна-савецкае кіраўніцтва БССР аб незалежнасці нават не заікалася, а ў сталінскія часы, магчыма, нават і думаць баялася. Пры чым жа тут незалежнасць адносна даты 3 ліпеня?

Пытанне ёсць і адказваць трэба.

Гэты факт, як адзначаюць некаторыя даследчыкі, трэба разглядаць ў сувязі з папярэднімі ініцыятывамі Прэзідэнта. У прыватнасці, аб

№8 ліпень 2007 Выбар

змене дзяржаўнай сімволікі: па ініцыятыве А.Лукашэнкі ў 1995 адбылася замена гістарычнай нацыянальнай дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь, зацверджанай Вярхоўным Саветам у верасні 1991 г., на крыху паднoўленую сімволіку савецкіх часоў.

Не магу ўстрымацца, каб у сувязі з гэтым не працытаваць, на мой погляд, унікальны дакумент сучаснай гісторыі. Гэта публікацыя ў газеце "Звязда" за 1995 г. пад загалоўкам "Раўненне на герб і сцяг":

«Пад старшынствам народнага мастака Беларусі акадэміка М.А. Савіцкага адбылося пасяджэнне журы аб'яўленага Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь конкурсу на лепшы тлумачальны тэкст Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.<...>Вызначана, што галоўнай мэтай когнкурсу з'яўляецца найбольш поўнае раскрыццё сэнсу і значэння адобраных на ўсенародным рэферэндуме 14 мая 1995 года цяперашніх сімвалаў Рэспублікі Беларусь у цэлым, а таксама асобных іх элеменатў.

Тлумачальныя тэксты да Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь павінны змяшчаць падрабязнае тлумачэнне гістарычнага, культурнага і эстэтычнага сэнсу і зместу ўсіх элементаў герба і сцяга.

<...>

Для пераможцаў конкурсу ўстанаўліваюцца:

дзве першыя прэміі<...>;

дзве другія прэміі<...>.

Устанаўліваюцца таксама памятныя прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь для заахвочвання аўтараў найбольш арыгінальных работ.

<...>

Конкурс праводзіцца з 25 снежня 1995 г. па 1 мая 1996 г.

Вынікі конкурсу падводзяцца і аб'яўляюцца да 12 мая 1996 г.

Матэрыялы на конкурс накіроўваюцца па адрасу: Рэспубліка Беларусь, 220016, г. Мінск, вул. К.Маркса, 38 з паметкай "На конкурс". БЕЛТА».

Удумайцеся ў тэкст: спачатку на рэферэндуме прынімаюцца прапанаваныя Прэзідэнтам новыя-старыя герб і сцяг, а потым абяцаюцца прэміі за тое, хто найбольш арыгінальна растлумачыць, абгрунтуе тое, што нядаўна прапанавалі і што выдаецца за нацыянальную дзяржаўную беларускую сімволіку.

Я устрымаюся ад цытавання тых тлумачэнняў, якія мне давялося пачуць ад вельмі паважаных мною людзей...

У тым жа 1995 г. рускай мове быў нададзены статус дзяржаўнай (у выніку чаго, як усім бачна, беларуская мова зноў выціскаецца з усіх сфер грамадскага жыцця).

У гэтым кантэксце перанос даты галоўнага свята краіны і спробу падмены яго назвы можна разглядаць як частку рэалізацыі ідэі палітыка-псіхалагічнай пераарыентацыі насельніцтва Беларусі на іншыя каштоўнасці.

Ёсць і яшчэ адзін аспект змены даты Дня незалежнасці. Яго няцяжка заўважыць, калі прасачыць змест выступленняў сучасных афіцыйных каментатараў, у якіх паўстаюць цені сталінскіх часоў.

Вядома, што ў гады вайны беларускі рух і перамога ў вайне ўздымалі ў беларусаў пачуццё нацыянальнай годнасці і патрыятызму. Сталінскі рэжым асцерагаўся ўздыму беларускага (як і ўкраінскага) нацыяналізму. Таму па загадзе з Маскавы ў лютым 1945 г. ЦК Кампартыі Беларусі прыняў спецыяльную рэзалюцыю аб перавыхаванні грамадства ў духу савецкага патрыятызму і нянавісці да нямецкіх акупантаў, якіх на Беларусі ўжо не было з 1944 года.

Прынімаліся іншыя партыйныя рашэнні і дырэктывы, якія асуджвалі спробы беларускай інтэлігенцыі супрацьстаяць насаджэнню рускай культуры.

Узмацняючы ідэалагічны тэрор і барацьбу з беларускім нацыяналізмам, бальшавікі ўмела скарысталі факт супрацоўніцтва беларускіх дзеячаў з нацыстамі, каб дыскрэдытаваць беларускую ідэю. Адказнасць за злачынствы нацыстаў беспадстаўна перакладалася на ўсіх беларусаў, якія супрацоўнічалі з немцамі. Гэта добра вядомы прыём псіхалагічнай вайны, калі для дыскрэдытацыі пэўных асобаў ці арганізацый іх ставяць у адзін шэраг з сапраўднымі злачынцамі.

Такім чынам натуральная варожасць да нацызму (фашызму) паступова, незаўважна трансфармавалася ў варожасць да паслваенных дзеячаў і усяго беларускага – мовы, культуры, нацыянальных традыцыяў і сімвалаў. Грамадзянаў Беларусі прывучалі ўспрымаць як сінонімы словы "фашызм" і "нацыяналізм", беларускія герб ("пагоня") і бел-чырвона-белы сцяг – як фашысцкія, неаднаразова ажыццяўляліся выпады супраць прадстаўнікоў беларускай культуры, носьбітаў беларускай мовы.

Такія прыёмы час ад часу выкарыстоўваюцца і зараз. Гледачы, магчыма, памятаюць, як беларускае тэлебачанне некалькі разоў пракручвала фільм рэжысёра Ю.Азаронка "Дети лжи", у якім у адзін відэашэраг ставіліся фашысты, дзеячы беларускай калабарацыі і палітычныя апаненты А.Лукашэнкі прадстаўнікі сучаснай апазіцыі З.Пазьняк, лідэр партыі БСДП(Народная Грамада) М.Статкевіч і іншыя.

Паколькі беларускія суды, як правіла, "не заўважаюць" абраз прадстаўнікоў апазіцыі з боку ўладных асобаў (словы "вшивые блохи", "отморозки", "дебилы" – сталі для некаторых амаль нормай), то Мікола Статакевіч, як былы афіцэр, абараніў свой гонар самым даступным спосабам – ён адказаў Ю.Азаронку метадам фізічнага ўздзеяння (працсей кажучы, даў па ... па твары). Дарэчы, у ходзе конкурса "Еўрабачанне" такі ж метад уздзеяння на Ю.Азаронка прымяніў і прадзюсер Д.Калдуна Філіп Кіркораў. Няблагая тэндэнцыя...

Такім чынам, па факту пераносу святкавання Дня незалежнасці мы можам зрабіць дзве высновы:

Па-першае, гэта можна разглядаць як чарговую спробу ўрэзаць ці перакруціць гістарычную памяць грамадзянаў Беларусі, навязаць думку, што незалежнасць мы атрымалі у вайне з нацыстамі, а не ў выніку развалу СССР, палымяным прыхільнікам якога доўга падаваў сябе першы прэзідэнт Беларусі. Інакш атрымліваецца, што той, хто выступае за захаванне Саюзу ССР, сам таго, магчыма, не жадаючы, ускосна выступае праціўнікам дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці Беларусі. Здаецца, гэта зразу

Па-другое, назіраецца нястрыманая эксплуатацыя тэмы мінулай вайны і вялікай Перамогі (амаль аднолькавыя тэксты, песні, каментары і выступленні ветэранаў гучалі 9 мая, 22 чэрвеня, 3 ліпеня ды і ў іншыя дні). Яна дае магчымасць увесь час далучаць СЯБЕ да ліку пераможцаў (казаць "НАША ПОБЕДА"!), адначасова ствараць вобраз гаранта міру і раз-пораз нагадваць аб беларусах, якія супрацоўнічалі з нацыстамі, а потым іх негатыўны вобраз як масток перакідаваць на сучасную апазіцыю.

І не важна, што 3 ліпеня ніякай незалежнасці Беларусь не атрымала. Галоўнае – што гэта не звязана з так званымі беларускімі нацыяналістамі (хаця ў Вярхоўным Савеце 1991 г. падаўляючую большасць мелі якраз прадстаўнікі Кампартыі Беларусі), якія пасмелі аб'явіць святам Незалежнасці менавіта той дзень 27 ліпеня, калі яшчэ савецкая Беларусь стала на шлях сапраўднага суверэнітэту.

Аднак разуменне суверэнітэту і незалежнасці, як найвышэйшых каштоўнасцяў народа, засвойвае ўсё большая частка нашага грамадства. Хутчэй за ўсё, кропка яшчэ не пастаўлена. Магчыма, яе паставяць нашы нашчадкі.

*Аляксандр Каданчык,*
*кандыдат гістарычных навук.*

# У адпаведнасьці з статутам і заканадаўствам



ПАСЬЛЯ КАНГРЭСУ ДЭМСІЛАЎ, ЯКІ НЯ ВЫЯВІЎ СЯБЕ ЯК ФОРУМ АБ'ЯДНАНЫХ ДЭМАКРАТАЎ, Ў РЭГІЁНАХ РАСПАЧАЛОСЯ ПРЫКМЕТНАЕ І АДЧУВАЛЬНАЕ РУШЭНЬНЕ ПАД ЯДНАЮЧЫМ ЗАКЛІКАМ "ЗА СВАБОДУ!" ІДЭЯ І ФАРМУЛЯВАНЬНЕ НОВАЙ ГРАМАДЗКАЙ ПЛЫНІ ЗЬВЯЗАНАЕ З ІМЕМ І ПОСТАЦЬЦЮ АЛЯКСАНДРА МІЛІНКЕВІЧА. АДНАК ЖА РЭСУРС НАВАТ І САМАГА АЎТАРЫТЭТНАГА ІМЯ І САМАЙ ПАВАЖАНАЙ ПОСТАЦІ, ЯК ВЯДОМА, ВЫЧАРПАЛЬНЫ. ПОСЬПЕХ І ВЫНІК СПРАВЫ Ў КОЖНЫМ КАНКРЭТНЫМ РЭГІЁНЕ БУДЗЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ТЫХ, ХТО ЎСТУПІЦЬ У ШЭРАГІ НОВАГА РУХУ, БУДЗЕ ІНІЦЫЯВАЦЬ ЯГОНЫЯ СПРАВЫ І ДАМАГАЦЦА ВЫНІКУ Ў АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНІ ПРЫВАБНАЙ – А ЦІ БЫЛА КАЛІ Ў НАС ДРЭННАЯ --ПРАГРАМЫ.
ТАКІМ ЧЫНАМ САМ САБОЮ ПЕРАД НАМІ ЎЗЬНІК ПЕРШЫ АДРАСАНТ НАШЫХ ПЕРШЫХ ПЫТАНЬНЯЎ АБ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ФІЛІІ РУХУ "ЗА СВАБОДУ!" – В.А. КААРДЫНАТАРА РУХУ ПА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ВІТАЛЬ ВАСІЛЬКОЎ.

- Спадар Віталь, сёньня актыўныя людзі ўжо, як гаворыцца, разабраныя па партыях і НДА. Дзе ваш Рух знойдзе людзей для сваёй дзейнасьці? Ці будзе ён займацца стварэньнем, сфармаваньнем собскай базы для папаўненьня сваіх шэрагаў і структураў? Ці ставіце вы перад сабою такую мэту?

